Усё гэта абумоўлівае прымяненне ў даследаванні палітычнай групоўкі сістэмнага падыходу, як найбольш эфектыўнага метаду.

1. Ходзін, С.М. Крыніцы гісторыі Беларусі (гісторыка-генетычнае і кампаратыўнае вывучэнне): вучэбны дапаможнік / С.М. Ходзін. – Мінск: БДУ, 1999. – 193 с.
2. Chojnowski, A. Piłsudczycy u władzy. Dzieje BBWR / A. Chojnowski. – Wrocław-Warszawa [et al.]: Wyd-wo Ossolineum, 1986. – 294 s.
3. Государственный архив Брестской области (ГАБО). – Ф. 1. – Оп. 9. – Д. 2475.
4. Szymanowski, G. Dwanaście lat – wspomnienia z lat 1927–1939 / G. Szymanowski. – Toruń: Wyd-wo A. Marszałek, 1998. – 312 s.
5. Świtalski, K. Diarusz 1919–1935 r. / K. Świtalski. – Warszawa: Czytelnik, 1992. – 840 s.
6. Rozporządzenie prezydenta Rzeczypospolitej z 19 stycznia 1928 r. o organizacji w zakresie władz administracji ogólnej, poz. 86 // Dziennik Ustaw Rzeczypospolitej Polskiej. – 1928. – № 11.
7. Kabot, T. Z działalności BBWR w województwie Poleskim w latach 1928–1935 // Res historica. – 1999. – Z. 8. – S. 71–81.
8. Cichoracki, P. Wybory 1935 r. w okręgu nr. 55 (Pińsk, Łuniniec, Stolin) // Гістарычная брама. – № 1 (25). – 2010. – С. 31–39.
9. Ким, И. Парламентские выборы 1935 г. в Полесском воеводстве / И. Ким // Гістарычная брама. – № 1 (24). – 2009. – С. 42–51.
10. Ковальченко, И. Д. Методы исторического исследования / И. Д. Ковальченко. – М.: Наука, 1987. – 451 с.

**Субоцін А.А.**

## КРЫНІЦЫ ДЛЯ ВЫВУЧЭННЯ ШТОДЗЁННАГА ЖЫЦЦЯ СТАХАНАЎЦАЎ БССР (1935–1941 гг.)

У працэсе разгортвання стаханаўскага руху назіраюцца карэнныя змены ў матэрыяльным становішчы працоўных, узнікаюць новыя стымулы да ўдасканалення працы, а яго ўдзельнікі вылучаюцца ў асобную сацыяльную катэгорыю, якая становіцца новым эталонам людзей працы. Адзначаныя абставіны патрабуюць больш глыбокага аналізу сацыяльных наступстваў разгортвання стаханаўскіх кампаній. Для асвятлення спецыфікі штодзённасці ўдзельнікаў стаханаўскага руху ў якасці сацыяльнай праблемы важным будзе прыцягненне як вядомых друкаваных крыніц, так і не выкарыстаных раней архіўных матэрыялаў, што дазволяць выявіць асаблівасці матэрыяльных ўмоў жыцця перадавікоў, формы арганізацыі іх вольнага часу, стратэгіі паводзін у задавальненні побытавых патрэбаў і асаблівасці ўспрымання свайго штодзённага акружэння. Мэта даклада: выяўленне асаблівасцяў выкарыстання крыніцавай базы для вывучэння штодзённага жыцця стаханаўцаў БССР у 1935–1941 гг.

Для даследавання штодзённага жыцця стаханаўцаў можа быць выкарыстаны комплекс дакументальных, апавядальных і выяўленчых крыніц, якія раскрываюць сацыяльныя характарыстыкі стаханаўцаў БССР, даюць інфармацыю пра асаблівасці іх матэрыяльна-бытавога і культурнага становішча.

Сярод дакументальных крыніц у першую чаргу варта выкарыстаць пастановы вышэйшых партыйных, дзяржаўных, прафсаюзных органаў СССР і БССР, апублікаваныя ў зборніках дакументаў і матэрыялаў [2, 3, 6]. Гэтыя дакументальныя крыніцы датычыліся розных аспектаў развіцця народнай гаспадаркі, арганізацыі мерапрыемстваў па разгортванні стаханаўскага руху ў галінах эканомікі, дзе асобнымі пунктамі вылучаліся задачы па паляпшэнню бытавых умоў удзельнікаў руху, матэрыяльнай падтрымцы жанчын-стаханавак. Асноўная ж канцэпцыя зменаў матэрыяльнага становішча насельніцтва СССР па выніках разгортвання стаханаўскага руху і роля гэтай формы сацыялістычнага спаборніцтва ў пабудове сацыялізму была вызначана ў стэнаграме выступленняў І. Сталіна на І Усесаюзнай нарадзе стаханаўцаў у Маскве 14–17 лістапада 1935 г. [4].

Для даследавання вялікае значэнне мае шэраг неапублікаваных дакументальных крыніц, што захоўваюцца ў архівах Беларусі рэспубліканскага, абласнога і занальнага ўзроўню: фонды Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (НАРБ), Дзяржаўнага архіва Віцебскай вобласці (ДАВВ), Дзяржаўнага архіва Мінскай вобласці (ДАМВ), Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Полацку (ЗДА у г. Полацку) і іншыя. У пераліку архіўных крыніц значная колькасць інфармацыі па тэме штодзённасці стаханаўцаў знаходзіцца ў дакументах партыйных органаў, найперш, справаздачных: дакладных запісках аддзелаў ЦК КП(б)Б, мясцовых партыйных арганізацый, кіраўнікоў прадпрыемстваў па пытаннях разгортвання руху. У іх змяшчаюцца падрабязныя звесткі аб заработнай плаце ўдзельнікаў стаханаўскага руху на асобных гаспадарчых адзінках, асаблівасцях увядзення прагрэсіўна-здзельнай аплаты працы, аказанні грашовай дапамогі стаханаўцам і выплаце прэмій. Асобнае месца ў партыйных дакументах займае інфармацыя пра матэрыяльнае становішча стаханаўцаў сельскай гаспадаркі, а менавіта пра ўзровень забяспечанасці іх прадуктамі харчавання і рэчамі штодзённага ўжытку.

Каштоўнай крыніцай з'яўляюцца зводкі органаў Народнага камісарыята ўнутраных спраў БССР. У іх змяшчаюцца факты недахопаў, якія назіраліся на асобных прадпрыемствах пры ажыццяўленні матэрыяльнага забеспячэння стаханаўцаў. Акрамя гэтага зводкі адлюстроўваюць характар узаемаадносін у калектывах паміж стаханаўцамі і астатнімі працоўнымі, адмоўнае стаўленне некаторых рабочых і калгаснікаў да лепшага матэрыяльнага становішча стаханаўцаў.

Вялікае значэнне для вывучэння стаханаўскага руху, матэрыяльна-бытавога забеспячэння яго ўдзельнікаў, правядзення культурнай працы з імі маюць дакументальныя крыніцы прафсаюзных арганізацый. Грунтоўныя звесткі, напрыклад, змяшчаюць у сабе дакументы Беларускага рэспубліканскага савета прафесійных саюзаў (НАРБ, фонд 265), Цэнтральнага праўлення прафесійнага саюза рабочых тарфяной прамысловасці БССР (НАРБ, фонд 277), Цэнтральнага праўлення прафесійнага саюза рабочых гарбарнай прамысловасці БССР (НАРБ, фонд 283), Беларускага рэспубліканскага камітэта саюза рабочых малочна-мясных саўгасаў (НАРБ, фонд 297), Мінскага абласнога камітэта прафесійных саюза рабочых МТС (ДАМВ, фонд 493), Віцебскага гарадскога савета прафесійных саюзаў (ДАВВ, фонд 1021) і іншыя.

У адзначаных архіўных фондах змяшчаецца бягучая перапіска паміж цэнтральнымі прафсаюзнымі органамі і прафсаюзнымі камітэтамі прадпрыемстваў, дзе адлюстраваны пытанні бытавога і культурна-масавага абслугоўвання стаханаўцаў і іх сем'яў, у прыватнасці багаты матэрыял па арганізацыі курортнага адпачынку перадавікоў. Вялікі пласт дакументаў прафсаюзных арганізацый займаюць справаздачныя матэрыялы, якія ўключаюць у сябе звесткі пра правядзенне мерапрыемстваў стаханаўскага руху, дакладныя запіскі пра стан руху па асобных прадпрыемствах і раёнах (у іх знаходзіцца інфармацыя, якая датычыцца ўзроўню заработнай платы стаханаўцаў, крыніц фарміравання бюджэту іх сем'яў, харчовага і жыллёвага забеспячэння перадавікоў, іх медыцынскага, культурнага абслугоўвання, цікавымі з'яўляецца вынікі апытанняў стаханаўцаў, па якіх можна прасачыць узровень матэрыяльнага становішча перадавікоў і характар іх побытавых патрэбаў). Важнай крыніцай у справаздачнай дакументацыі з'яўляюцца спісы стаханаўцаў па асобных гаспадарчых адзінках, рэгіёнах і БССР у цэлым, дзе ўказаны ўзрост, працоўны стаж, сацыяльнае паходжанне, а таксама адзначаны матэрыяльныя і маральныя ўзнагароды перадавікоў за працоўныя рэкорды. Інфармацыю пра сістэму аплаты працы стаханаўцаў і іх колькасны склад утрымліваць у сабе статыстычныя дадзеныя прафсаюзных арганізацый.

Сярод архіўных крыніц трэба вылучыць дакументы асобных прадпрыемстваў. Напрыклад, фонд Віцебскага шчацінна-шчотачнага камбіната (ДАВВ, фонд 96) утрымлівае улікова-кантрольную дакументацыю, прадстаўленную ў выглядзе індывідуальных картак стаханаўцаў з іх біяграфічнымі звесткамі, характарыстыкамі працоўнай і грамадскай дзейнасці, узроўнем заработнай платы.

Другую вялікую групу крыніц складаюць апавядальныя. Сярод іх важнае значэнне для даследавання штодзённасці маюць папулярныя брашуры, выдадзеныя ў другой палове 1930-х гг. [1, 5, 7–11], у якіх змяшчаюцца аўтабіяграфіі стаханаўцаў і іх расказы пра здзяйсненні сваіх працоўных рэкордаў, пра матэрыяльны стан. Нягледзячы на тое, што брашуры былі надрукаваныя з агітацыйнымі мэтамі для стварэння ідэальнага вобразу стаханаўцаў у грамадстве і ўтрымліваюць у сабе шмат савецкіх моўных штампаў, гэтыя крыніцы паказваюць на тое, як паляпшаліся ўмовы жыцця стаханаўцаў, і якую палітыку праводзіла дзяржава для павышэння іх культурнага ўзроўню.

Каштоўнай групай крыніц, якая сумяшчае рысы як апавядальнага, так і дакументальнага тыпу, з’яўляецца перыядычны друк. Пры правядзенні даследавання штодзённага жыцця стаханаўцаў вялікае месца займаюць матэрыялы рэспубліканскіх газет “Звязда”, “Рабочий” і “Советская Белоруссия”. Публікацыі ў пералічаных выданнях дазваляюць значна дапоўніць дакументальныя звесткі пра разгортванне стаханаўскага руху і становішча стаханаўцаў. У прыватнасці ў газетах быў надрукаваны шэраг пастаноў дзяржаўных і прафсаюзных органаў, што датычыліся паляпшэння матэрыяльных умоў жыцця стаханаўцаў і ўзнагарод за выдатную працу. Багаты матэрыял змяшчаюць у сабе артыкулы карэспандэнтаў газет: тут вызначаецца пэўная інфармацыя па харчоваму і жыллёваму забеспячэнню стаханаўцаў, арганізацыі іх адпачынку і вольнага часу, мерапрыемствах, звязаных з ўзбагачэннем ведаў перадавікоў. У прыватнасці шмат матэрыялаў у газетных публікацыях можна знайсці пра дзейнасць Універсітэта выхаднога дня для стаханаўцаў Мінска.

Важнае месца сярод газетных публікацый займаюць эпісталярныя матэрыялы – гэта індывідуальныя і калектыўныя лісты стаханаўцаў у рэдакцыі газет, у якіх пераважна змяшчаліся скаргі на недахопы працы мясцовых кіраўнікоў пры арганізацыі харчавання, адпачынку, забеспячэння жыллём, таварамі першай неабходнасці, а таксама прыводзіліся прапановы па лепшаму правядзенню вольнага часу. Хаця адзначаныя лісты былі строга адрэдагаваныя, яны змяшчаюць у сабе каштоўную інфармацыю пра асаблівасці ажыццяўлення дзяржаўнай палітыкі, накіраванай на матэрыяльную падтрымку стаханаўцаў і вызначаюць праблемы, якія ўзнікалі пры гэтым. Акрамя таго па адзначаных лістах можна вылучыць спецыфіку ўсведамлення “знатнымі людзьмі” свайго месца ў грамадстве і іх матэрыяльныя патрэбы.

Рэспубліканскія газеты таксама змяшчаюць у сабе шэраг выяўленчых матэрыялаў, прадстаўленых фотаздымкамі, якія адлюстроўваюць розныя бакі побыту стаханаўцаў прамысловасці і сельскай гаспадаркі. Безумоўна, што гэта былі ў большасці сваёй пастановачныя фота, што мелі агітацыйных характар, але, нягледзячы на гэта, яны даюць магчымасць вызначыць высокі статус стаханаўцаў у грамадстве і паказаць, як іх штодзённасць звязвалася з паказнымі бакамі тагачаснага грамадскага жыцця.

Такім чынам, для вывучэння штодзённага жыцця стаханаўцаў БССР можа быць выкарыстаны шэраг разнастайных крыніц: пастановы вышэйшых дзяржаўных і гаспадарчых органаў БССР і СССР, што датычыліся арганізацыі сацыялістычнага спаборніцтва, і дзе вызначаліся задачы па паляпшэнню матэрыяльнага становішча ўдзельнікаў стаханаўскага руху; справаводчыя дакументы партыйных і прафсаюзных арганізацый, у якіх знаходзіцца багаты матэрыял па заработнай плаце, харчоваму,

медыцынскаму і жыллёваму забеспячэнню стаханаўцаў, мерапрыемствах па арганізацыі іх вольнага часу; папулярныя брашуры аб стаханаўцах розных галін і прадпрыемстваў БССР з іх кароткімі аповядамі пра свой жыццёвы і працоўны шлях; публікацыі рэспубліканскіх газет, што даюць дадатковую інфармацыю пра розныя бакі штодзённасці стаханаўцаў, змяшчаюць лісты, фотаздымкі з побыту перадавікоў.


1. За стахановскую работу на стройках. – Мн.: Государственное издательство Белоруссии, 1936. – 84 с.
2. Коммунистическая партия Белоруссии в резолюциях и решениях съездов и пленумов ЦК: в 6 т. / Ин-т истории при ЦК КПБ. – Мн.: Беларусь, 1983–1987. – Т. 3: 1933–1945 / под ред. Г. Г. Барташевича и др. – 1985. – 551 с.
3. Коммунистическая партия Советского Союза в резолюциях и решениях съездов, конференций и пленумов ЦК / Институт марксизма-ленинизма при ЦК КПСС. – 9-е изд., доп. и испр. – М: Политиздат,1983 – 1990. – Т.6. – 1985. – 431 с.
4. Первое Всесоюзное совещание рабочих и работниц-стахановцев. 14–17 ноября 1935 г. Стенографических отчёт. – М.: Партиздат ЦК ВКП(б), 1935. – 397 с.
5. Радасная праца, радаснае жыццё. – Мн.: Дзяржнаўнае выдавецтва Беларусі, 1936. – 64 с.
6. Развитие социалистического соревнования в Белорусской ССР (1919–1941 гг.): документы и материалы / Гл. арх. упр. при Совете Министров БССР и др.; [Составитель Васильева Р.С. и др.]. – Мн: Беларусь, 1980. – 272 с.
7. Стаханаўкі льнаводства БССР. – Мн.: Белпартвыдавецтва ЦК КП(б)Б, 1936. – 35 с.
8. Стаханаўская змена на скурзаводзе “Бальшавік”. – Мн.: Белпартвыдавецтва ЦК КП(б)Б, 1936. – 64 с.
9. Стаханаўскім шляхам. – Мн.: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1936. – 64 с.
10. Стаханаўцы “Камунаркі”. – Мн.: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1936. – 64 с.
11. У калоне перадавікоў. – Мн.: Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, 1936. – 64 с.


**Кузнецова Т.И.**

## „ES VIŅU PAZĪSTU: LATVIEŠU BIOGRĀFISKĀ VĀRDNĪCA” (1939): ОПЫТ АНАЛИЗА ИСТОЧНИКА

В основе данной работы лежит ряд не блещущих новизной, но для автора важных положений, которые определяют методы анализа исторических источников и, прежде всего, вербально-письменных. Во-первых, исторический источник – это любой текст, понимаемый как различного характера внешнее выражение человека, которое в силу этого является актом и результатом коммуникации. Поэтому текст можно определить как узел разнохарактерных и разноуровневых социальных связей. Во-вторых, текст является целостностным и качественно определенным. В-третьих, природа текста двойственна: он и творение, исторически, социально и индивидуально обусловленное в своем «рождении», и творец, обладающий социальным созидательно-разрушительным потенциалом. В-четвертых, ядром текста (в обоих его ипостасях) является воплощенная в нем, в его разного уровня структурных компонентах определенная картина мира, причем как отражающая наличные представления людей о себе и о мире, так и формирующая их. И в-пятых, любого характера текст есть составная часть социальной реальности – «физической», и эмоционально-ментальной, являющейся предметом исторической науки. И сама реальность предстает системой разнородных текстов, анализируя которые историк пытается увидеть, понять и в конечном итоге реконструировать социальное целое.

Для Латвии конца 30-х годов XX века особой значительностью обладал такой текст как биографический словарь «Es viņu pazīstu: Latviešu biogrāfiskā vārdnīca/ Я его знаю: Латышский биографический словарь», изданный в 1939 году. Редактором этой книги стал человек достаточно молодой (родился в 1902 году), закончивший классическую гимназию в Елгаве, учительские курсы, изучавший в Латвийском университете теологию и юриспруденцию и рано начавший активную жизнь публициста: с 1923 по 1975 год он был членом редакции и редактором многих газет и журналов, опубликовав более 1000 газетно-